# АБАРВАНАЯ ПЕСНЯ...

## З успамінаў М.Г.Станкевіч, в. Людзвінова

Вайна... Яна ўжо аддалілася ад нас на сталы чалавечы век. Тым, хто нарадзіўся ў пераможным 1945-ым, сёлета споўніцца, як і Вялікай Перамозе, пяцьдзесят пяць. Міколку Запольскаму добрая лясная зязюлька не адлічвала ні пяці, ні дзесяці, ні дваццаці гадоў. Фашысцкая куля абарвала жыццё Міколкі ў трохгадовым узросце. Побач ад куль упалі яго маці, бабуля і дзядуля, цётка Маня...

Запольскія не былі карэннымі жыхарамі Людзвінова. Прыехалі сюды ў пошуках працы, парабкавалі ў пана. А вось сям'я Аскеркаў – вялікая, дружная - служыла ў мясцовым панскім двары вельмі даўно. Дзеці Запольскіх і Аскеркаў сябравалі, сыны, ненавідзячы панскі прыгнёт і прагнучы вольнага жыцця, цікавіліся падпольнай работай. І прыход Чырвонай Арміі ў верасні 39-га, якога чакалі людзі ў Людзвінове і навакольных вёсках, для сем'яў парабкаў быў асабліва радасным святам.

- Памятаю Першамай 1940 года, першы пры савецкай уладзе, - успамінае старэйшая жыхарка Людзвінова, заслужаная калгасніца Марыя Гаўрылаўна Станкевіч. - У Вялікай Берастаўіцы быў мітынг, канцэрт, танцы. Сабралася моладзь з мястэчка і навакольных вёсак, былі тут, вядома, хлопцы і дзяўчаты Запольскія і Аскеркі. Насця Запольская гэтак ужо цудоўна спявала пасля мітынгу савецкія песні! Голас мела незвычайны. І сама была гэткая пекная, гэткая здатная дзяўчына. Малодшая яе сястра Маня - таксама пявуння і прыгажуня. Толькі вось лёс абедзвюх чакаў жудасны...

Замуж Насця выйшла за пархімаўскага хлопца Аляксандра Шымавалоса. Тут, у яго сям'і, жылі маладыя. Нарадзіўся сынок Міколка, прынёсшы ў хату гэтулькі шчасця, гэтулькі радасці! Аляксандра прызвалі ў войска, служыў у Расіі. Там і застала яго 22-ое чэрвеня 1941 года, зрабіўшы франтавіком, салдатам вайны. Насця з Міколкам апынуліся пад акупацыяй фашыстаў. І трэба было жыць, працаваць, гадаваць сына. А ён рос надзіва прыгожым, кемлівым, цікаўным хлопчыкам, з кожным днём адкрываў для сябе нешта новае ў гэтым велізарным, добрым і даверлівым свеце, сагрэтым матулінай усмешкай і пяшчотай. Малы быў сынок, не мог зразумець, што побач ходзяць дарослыя людзі-пачвары з аўтаматамі, якім чамусьці патрэбна яго жыццё, як патрэбны жыцці мільёнаў дзяцей і дарослых, якіх расстрэльвалі, катавалі, спальвалі ў печах і газавых камерах.

...Нікога з вяскоўцаў, бадай, не здзівіла, што сын Запольскіх і адзін з сыноў Аскеркаў (дакладных імёнаў іх, на жаль, не ведаю) мелі нейкую сувязь

з партызанамі. Такія ўжо былі яны адчайныя, рашучыя хлопцы. Праз некаторы час пра сувязь гэтую нейкім чынам стала вядома і фашыстам. Нам не ўдалося высветліць, як загінулі юнакі. Адны старажылы з навакольных вёсак сцвярджаюць, што іх расстралялі, другія - што карнікі акружылі іх на закінутым хутары і спалілі, трэція - што на той раз хлопцам усё ж удалося пад покрывам дыму ўцячы ў недалёкі лес, а варожыя кулі дасталі іх ужо потым, праз колькі часу...

А вось тое, што зрабілі фашысты з сем'ямі Запольскіх і Аскеркаў, ускалыхнула не толькі Людзвінова. Арыштавалі ўсіх, бацькоў і дзяцей. Была ў той час у Людзвінове і Насця з сыночкам. Хоць і перасцерагалі яе людзі: не хадзі да бацькоў, у родную хату, там могуць схапіць фашысты. Аднак не верыла, мусіць, сэрца маладой жанчыны, што можна ўчыніць такое зверства.

...Іх павезлі спачатку ў Крынкі, потым - у Беластоцкую турму, падвалы якой схавалі ад маленькага Міколкі і блакіт неба, і сонейка і якая была сумна вядомай расстрэламі вязняў, смерцямі ад голаду і катаванняў. Невядома, ці доўга пакутавалі малы і яго матуля, бабуля Пелагея, дзядуля Георгій, цётка Маня. Толькі аднойчы жанчына са Старынцоў, якая жыла ў Беластоку і насіла перадачы сваім вязням - родным, убачыла ў спіску вязняў прозвішчы Запольскіх і Аскеркаў, памечаныя чорнай лініяй. І зразумела: іх расстралялі. Як расстралялі і сям'ю Аскеркаў, таксама памечаную чорным...

Гэта быў 43-ці год. У 44-м у Пархімаўцы прыйшло з фронту апошняе пісьмо ад Аляксандра. Ён ужо ведаў, што жонка і сын арыштаваны, але пра тое, што прынялі смерць, не... Ведаў, што ўжо ваююць з фашыстамі яго брат Іван і іншыя пархімаўскія хлопцы.

Ні Аляксандр, ні Іван, як і многія аднавяскоўцы, не вярнуліся з вайны.

На самай прыгожай ноце абарвалася жыццёвая песня Насці Запольскай і яе сястры, як і песні мільёнаў гэтак жа бязвінна загінуўшых у гады вайны. Закончылася, ледзь паспеўшы пачацца, зямное існаванне Міколкі. Але ёсць Ён, праведны Суддзя, ёсць незямны свет, дзе дабрадзейны атрымлівае свой вянец, а злачынца - сваё пакаранне. І сёння, напярэдадні радаснага свята Уваскрасення Хрыстова, мы ўсведамляем гэта з асаблівай верай.

Марыя Драпеза, в. Людзвінова, 2000 год.